
За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 11 (94) Лістапад 2014 г.

АНДРЭЯ ГАЙДУКОВА ПАСАДЗІЛІ НА 10 СУТАК

25 лістапада судзьдзя Полацкага гарадзкога суду Ўладзімер Бясецкі прызнаў былога палітвязьня вінаватым у парушэньні артыкулу 23.34 КаАП і за "правядзеньне несанкцыянаванага пікету з раздачай улётак" прысудзіў Андрэю Гайдукову арышт на 10 сутак.


Андрэй Гайдукоў

Інцыдэнт, які разьбіраўся ў судзе, адбыўся 24 лістапада ў Полацку. Міліцыя затрымала Гайдукова, які раздаваў мінакам улёткі пра палітвязьняў. Разам з Андрэем Гайдуковым быў затрыманы Антон Паўлаў, які фатаграфаваў акцыю. Абодвух адвезьлі ў міліцыю і прымусілі выдаліць усе здымкі. На Андрэя Гайдукова ў пастарунку склалі пратакол пра правапарушэньне. Тут жа ўручылі позву ў суд — 27 лістапада на 16:30. Аднак на наступны дзень пасьля падзеі апоўдні Андрэю Гайдукову дахаты прынесьлі іншую позву: пра тое, што суд адбудзецца зараз жа, а 14:00.

"У судзе я заявіў, што мне патрэбны абаронца, і што я маю дамову зь менскім адвакатам. Але дабрацца так хутка да Полацку ў яго няма фізычнай магчымасьці. Судзьдзя Ўладзімер Бясецкі чакаць не пагадзіўся: ён сказаў, што дае мне паўгадзіны, каб я заключыў дамову з полацкім адвакатам. Давялося гэта зрабіць, і я лічу, што маё права на абарону ў судзе парушанае: спачатку суд быў прызначаны на пазьнейшую дату, а потым яго перанесьлі і, фактычна, не далі магчымасьці запрасіць да ўдзелу ў працэсе таго адваката, якому я давяраю", — сказаў Андрэй Гайдукоў.

Наперадзе ў яго яшчэ адно разьбіральніцтва — наконт факту затрыманьня 21 лістапада. Ён быў затрыманы ў Наваполацку — таксама за распаўсюд улётак пра палітвязьняў. У наваполацкай міліцыі на яго склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных.

"Пратаколу я не падпісваў, копіі ня маю, таму не магу сказаць, у парушэньні якога артыкулу мяне вінавацяць. Я чуў, што па тэлефоне супрацоўнікі міліцыі камусьці тлумачылі, што мой выпадак будзе разьбіраць адміністрацыйная камісія. Але ніякіх позваў у мяне пакуль няма — ані на пасяджэньне камісіі, ані ў суд", — распавёў Андрэй Гайдукоў.

Андрэй Гайдукоў – былы палітзьняволены, 8 лістапада 2012 году супрацоўнікі КДБ затрымалі яго і завялі крымінальную справу паводле ч. 1 арт. 356 Крымінальнага кодэксу (здрада дзяржаве ў форме правядзеньня агентурнай дзейнасьці). Справа Гайдукова разглядалася ў закрытым рэжыме, падчас суду абвінавачаньне Гайдукову было перакваліфікаванае. 1 ліпеня 2013 году Віцебскі абласны суд асудзіў Гайдукова паводле крымінальнага артыкулу "Спроба ўсталяваньня супрацоўніцтва са спэцслужбамі, органамі бясьпекі або органамі замежнай дзяржавы". Яго прызналі "вінаватым у спробах устанаўленьня кантактаў з супрацоўнікамі замежнай спэцслужбы без прыкмет дзяржаўнай здрады". 8 траўня 2014 году Андрэй Гайдукоў выйшаў на волю.

У Віцебску арыштаваны заснавальнік праваабарончай установы «Платформ інавэйшан»



Міхаіл Жамчужны

Заснавальнік праваабарончай арганізацыі «Пляцформа» (прыватная культурна-асьветніцкая ўстанова «Платформ інавэйшан») **Міхаіл Жамчужны** арыштаваны ў Віцебску ў жніўні гэтага году, аднак дагэтуль бракуе інфармацыі аб прычынах ягонага арышту. Пра гэта паведамляе сайт «Пляцформы».

«Дагэтуль інфармацыі аб прычынах арышту Міхаіла Жамчужнага няшмат. Дакладна вядома, што крымінальная справа адносна яго распачатая паводле часткі 1 артыкулу 375 (наўмыснае раскрыцьцё эканамічных, навукова-тэхнічных ці іншых зьвестак, якія складаюць службовую тайну, асобай, якая мае або мела доступ да гэтых зьвестак). А таксама паводле часткі 2 артыкулу 376 (незаконныя выраб або набыцьцё ў мэтах збыту або збыт спэцыяльных тэхнічных сродкаў, прызначаных для сакрэтнага атрыманьня інфармацыі) Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь», — паведамляе «Пляцформа».

Сябры «Пляцформы» дагэтуль ня маюць зьвестак пра тое, у зьвязку з чым Жамчужнаму прад'яўленыя такія абвінавачаньні, а ў адваката ўзятая падпіска пра неразгалошваньне.

Міхаіл Жамчужны — колішні асуджаны па эканамічнай справе прадстаўнік «Пляцформы» ў Віцебску, а да зьняволеньня — дацэнт Віцебскага тэхналягічнага інстытуту, кандыдат тэхнічных навук.

Былы кіраўнік праваабарончай установы «Платформ інавэйшан» Андрэй Бандарэнка сёлета ў жніўні быў асуджаны на 3 гады зьняволеньня паводле артыкулу аб злосным хуліганстве. Праваабаронца на судзе прызнаў сваю віну часткова, але з такім прысудам не пагадзіўся і абскардзіў яго ў Менскім гарадзкім судзе. Калегія Менскага гарсуду пакінула прысуд бязь зьменаў. У апошнім слове на судзе Бандарэнка казаў пра магчымую правакацыю спэцслужбаў, але не адмаўляў і таго, што «сваімі дзеяньнямі гэтаму дапамог».

У блогера зь Віцебску забралі квадракоптар за палёт над кацельняю



Міліцыя заўважыла, як барадаты хлопец запусьціў квадракоптар з камэраю непадалёк ад кацельнай «Паўднёвая» ў Віцебску. Праваахоўнікі завезьлі хлопца ў пастарунак.

«Лепш бы я піў і паліў, як той хлопец, што сядзеў побач са мной у Першамайскім РАУС, — піша ў сваім блогу **Павал Клімянок**. — *Супрацоўнік КДБ пасьля доўгіх кансультацыяў праз тэлефон растлумачыў работнікам РАУС, што мне інкрымінуюць два артыкулы адміністрацыйнага кодэксу: «парушэньне паветранай прасторы» ды «пранікненьне на тэрыторыю аб'екту, статус якога мы яшчэ ўдакладнім».*

«Што я там спадзяваўся ўбачыць? Ды нічога! Я проста МОГ зазірнуць у трубу. Проста маючы такую магчымасць, яе не рэалізаваць — злачынства супраць свайго ўнутранага дзяцінства», — тлумачыць блогер.

Віцебскае аддзяленьне ўнутраных справаў Першамайскага раёну правярае факт канфіскацыі лятальнага апарату, які «быў зафіксаваны ў стане палёту над рэжымным аб'ектам», — зазначаецца ў адказе віцебскай гарадзкой пракуратуры на зварот Паўла Клімянка.

У Воршы ловяць футбольных фанатаў за марш па цэнтры гораду



16 лістапада ў Воршы адбыўся футбольны матч паміж клюбамі "Ворша" і "Крумкачы". Перад матчам мясцовыя фанаты групай прайшлі ад будынку езуіцкага калегіюму да стадыёну. Яны несьлі банэр і палілі фаеры. Пасьля таго, як інфармацыя пра шэсьце зьявілася ў СМІ, міліцыя ацаніла яго як несанкцыянаванае шэсьце з элементамі палітыкі.

Аршанская міліцыя пачала шукаць удзельнікаў акцыі з дапамогай фатаграфіяў на сайтах і ў сацыяльных сетках, а таксама з дапамогай вулічных камэр назіраньня і запісаў са стадыёну.

Паведамляецца, што ў аўторак 18 лістапада ў горадзе пачалася аблава на фанатаў. Моладзь выклікалі да ўчастковых, забіралі з вучобы і працы, з дамоў. Фанаты кажуць, што часам з дамоў іх забіралі амапаўцы, хаця маладыя людзі не зьбіраліся супраціўляцца. За першы дзень аблавы, паводле слоў відавочцаў, было затрымана каля 20-25 чалавек. Сярод іх былі і тыя, хто ня меў дачыненьня да шэсьця.

19 лістапада аблава працягнулася, гэтым разам затрымлівалі пераважна паўнагадовых фанатаў футбольнай каманды. Непаўнагадовым давалі падпісваць пратаколы тлумачэньня і адпускалі, на паўнагадовых складалі пратаколы за ўдзел і арганізацыю несанкцыянаванага шэсьця. Суд аштрафаваў за акцыю сама меней трох чалавек.

Міліцыя дагэтуль працягвае шукаць фанатаў, якія ўдзельнічалі ў шэсьці.

За журналісцкую фотасэсію ў Віцебску — штрафы ад 2,7 да 3 мільёнаў рублёў

28 лістапада ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску адбыліся слуханьні адміністрацыйных справаў журналістаў, якія сфатаграфаваліся на фоне гарадзкога графіці напярэдадні 5 лістапада. Зьміцер Казакевіч і Алена Сьцяпанава атрымалі штрафы ў 20 базавых велічыняў кожны (3 мільёны беларускіх рублёў), а Алена Шабуня — 18 базавых за парушэньне артыкулу 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі альбо правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

Разгляд справы Казакевіча судзьдзёй Аленай Цыганковай заняў каля 30 хвілін. З боку абвінавачаньня выступаў складальнік пратаколаў, начальнік аддзелу аховы правапарадку і прафіляктыкі АУС Чыгуначнага раёну Віцебску Аляксандар Рыбакоў. Ён сказаў, што "фотасэсія" была "акцыяй", бо, маўляў, так пісалі ў інтэрнэце. Вынік — штраф у 20 базавых велічыняў.

Пасьля абедзеннага перапынку падобны судовы працэс адбыўся і над журналісткай Аленай Сьцяпанавай. Судзьдзя Дзяніс Губанаў прызнаў яе вінаватай у парушэньні парадку арганізацыі альбо правядзеньня масавых мерапрыемстваў і таксама прызначыў штраф у 20 базавых велічыняў.



А. Шабуня, З. Казакевіч, А.Сьцяпанава

Пазьней той самы судзьдзя вынес рашэньне аштрафаваць Алену Шабуню на 18 базавых велічыняў. Меншыя памеры штрафу Дзяніс Губанаў патлумачыў тым, што ў яе трое дзяцей, сярод якіх двое непаўнагадовых.

Усяго заведзена сем адміністрацыйных спраў.

У Віцебску адмоўлена ў правядзеньні пікету за якасную мэдыцыну



А. Шабуня, Т. Севярынец

У Віцебску гарадзкія ўлады адмовілі ў правядзеньні пікету 30 лістапада «За якасную мэдыцыну» ў горадзе. Заяўку 12 лістапада ў межах кампаніі «Народны кантроль» падавалі прадстаўнікі «Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі». Афіцыйная прычына адмовы — адсутнасьць дамоваў з камунальнымі, мэдычнымі і праваахоўнымі службамі па забесьпячэньні прыборкі і аховы пікету.

Аднак, адзначае **каардынатарка аргкамітэту БХД Тацьцяна Севярынец**, без дазволу на правядзеньне пікету камунальнікі, мэдыкі і міліцыянты адмаўляюцца падпісваць якія-кольвек дамовы.

Віцебскім актывістам КХП–БНФ ізноў забаранілі пікетаваць

Чарговую забарону ладзіць пікет атрымалі ад мясцовых уладаў сябры Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ **Ян Дзяржаўцаў** і **Пётра Сарапеня**. Прычына забароны — традыцыйная для Віцебску: адсутнасьць у заяўнікаў акцыі дамоваў зь лекарамі, дворнікамі і міліцыянтамі. Пікет мусіў адбыцца 7 лістапада.


Пётра Сарапеня

Мэта акцыі, якая так і не адбылася, паводле заяўкі (цытата): «Інфармаваць грамадзян г. Віцебску аб наступствах контррэвалюцыйнага кастрычніцкага перавароту, зьдзейсьненага міжнароднай фашысцкай тэрарыстычнай арганізацыяй РСДРП-ВКП(б)-КПСС на чале зь нямецкім агентам, першым фашыстам у сьвеце Ўладзімерам Леніным (Л.Д. Ландаў) і аб неабходнасьці забароны ў Беларусі кампартыі і яе ідэалёгіі».


Ян Дзяржаўцаў

КХП-БНФ зьяўляецца лідэрам па колькасьці пададзеных заявак на правядзеньне масавых мерапрыемстваў у Віцебску. Але ніводная зь дзясяткаў заявак не была задаволеная ўладамі: апошнія спасылаюцца на незаключэньне арганізатарамі мерапрыемстваў дамоваў, прадугледжаных рашэньнем Віцебскага гарвыканкаму «Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску», хаця на практыцы заключыць такія дамовы немагчыма. Не атрымліваючы дазволаў на правядзеньне мірных сходаў ад уладаў, сябры КХП-БНФ час ад часу ладзяць несанкцыянаваныя акцыі, за што пасьля прыцягваюцца судамі да адміністрацыйнай адказнасьці.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.